# РАЛЯН БАРТ ЯК МЫСЬЛЯР ПАЛІТЫЧНАГА

Уладзіслаў Іваноў

ROLAND BARTHES AS A POLITICAL THINKER

© Uladzislaŭ Ivanoŭ

PhD, lecturer, European Humanities University (EHU)
17 Savičiaus Str., 01127 Vilnius, Lithuania

ORCID ID: https://orcid.org/0000-0003-1493-0017
E-mail: uladzislau.ivanou@ehu.lt

*Abstract:* The analysis of Roland Barthes's texts demonstrates that professional and amateur interests of the thinker went beyond semiotics, literature, sociology. He had a keen interest in history, politics, philosophy, and language. In his life, Barthes was not known as a political thinker – only now his legacy is beginning to be interpreted through the prism of political science. For example, R. Barthes proposed an important, interesting and new interdisciplinary approach to the understanding and theorizing of policy (e.g. the distinction between *policy* (*le politique*) and *politics* (*la politique*)). Thanks to Barthes's interest in the notion of politics and thanks to his interdisciplinary approach, phenomenon of the apolitical becomes more understandable.

His critical arguments about the ways of development and the future of the left and the right, the role and place of the intellectuals in society (democratic and authoritarian), gender equality, politics of language, conformism under democracy, etc. are still topical in the current debate. In addition, many of the concepts and approaches of R. Barthes were later adopted by gender research theorists.

Thus, the celebration of the centenary of the birth of the thinker prompted the discovery of new directions and interests of the semiologist, and demonstrated the importance of an interdisciplinary study of social and political phenomena. Finally, this article notes the influence of a personal, intimate factor on research. In particular, the topic of taboo and the importance of homosexuality in the life and studies of the thinker is addressed.

*Keywords:* ideologies, political ideology, political thinker, political myth, political history, intellectual and policy.

Нават пазбаўлены ўлады, інтэлектуал заўсёды можа дзейнічаць.

Р. Барт (Barthes, tome 4, 2002, p. 570)

Французская мова – правая: усё, што йдзе, хістаючыся, усё, што зьбіваецца, усё, што нягеглае і ўсё, што замінае, яна назвае лявіцай; і лявіца становіцца паняткам маральным, асуджэньнем і выракам, яна становіцца паняткам фізычным, чыстым вызначэньнем, якое брутальна замяняе стары панятак «senestre[1]», што азначае ўсё тое, што ў левым баку чалавечага цела.

Р. Барт (Noudelmann, 2001)

Сям'я без сем'янізму[2].

Р. Барт (Barthes, 1975, p. 31)

## Уступ

Стагодзьдзе зь дня нараджэньня Раляна Барта ўрачыста адзначылася ў 2015 годзе ва ўсім сьвеце. З гэтай нагоды, але і ня толькі, спадчыну французскага мысьляра, літаратуразнаўцы, сэміёляга, філёзафа, крытыка ацэньвалі праз прызму шматлікіх дысцыплінаў. Аналіз тэкставай спадчыны (Barthes, 1993–2002) мысьляра дэманструе, што прафэсійныя і аматарскія зацікаўленасьці Р. Барта выходзілі па-за межы выключна сэміётыкі, літаратуразнаўства, сацыялёгіі, ён шмат цікавіўся і пісаў аб гісторыі, літаратуры, палітыцы, філязофіі, мове, аб тым, што сяньня мы называем «гендарныя штудыі» і пад. Цікавая і крытычная спадчына развагаў, артыкулаў на палітычныя тэмы забытая ці па-просту недаацэньваецца палітолягамі, напрыклад[3]. Бартам быў прапанаваны важны, цікавы і новы міждысцыплінарны падыход у тэарэтызаваньні і разуменьні палітычнага (напрыклад, што да адрозьненьня паміж *le politique et la politique*). Пры жыцьці Барта ня ведалі як мысьляра палітычнага – толькі сяньня ягоная спадчына пачынае трактавацца праз паліталягічную прызму (Noudelmann, 2001). Ягоныя крытычныя развагі пра шляхі разьвіцьця і будучыню палітычных лявіцы і правіцы, пра ролю і месца інтэлектуалаў у грамадзтве (дэмакратычным і аўтарытарным), пра роўнасьць палоў, пра палітыку рэфармаваньня мовы, пра распаўсюд канфармізму ў дэмакратыі і пад. дасюль зьяўляюцца актуальнымі і дапаможнымі ў цяперашніх дэбатах (F. Gaillard, F. Noudelmann, 2001).

1 Левабаковы, левы (заўвага аўтара).

2 Па-беларуску ў цытаце ўжыты нэалягізм «сем'янізм», каб коратка перадаць французскае слова «familialisme», якое азначае «перабольшаны, празьмерны культ сям'і» (заўвага аўтара).

3 Што відавочна праз адсутнасьць рэпрэзэнтатыўных крыніцаў на беларускай, расейскай, ангельскай ды іншых мовах, дзе б давалася кампэтэнтная ацэнка поглядам Р. Барта ў паліталягічнай пэрспэктыве.

У Францыі ў паліталягічным вымярэньні Ралян Барт часьцяком трактуецца як проста крытык ідэалёгіяў, ідэалягічнага (Ibid., pp. 45–46). Не існуе выразу «бартаўскі» як назвы плыні ці школы, тым ня менш, існуе ўнівэрсытэцкая спэцыялізацыя па інтэлектуальнай спадчыне Барта. На жаль, палітолягі як Францыі, так і Беларусі ігнаруюць палітычную думку Р. Барта. Бо якраз дзякуючы не паліталягічнай адукацыі, не заангажаванасьці ў паліталягічныя і палітычныя колы, ягоны, так бы мовіць, вонкавы погляд на фэномэн палітычнага ўспрымаецца прасьцей, цікавей, а галоўнае, даступней. Мысьляр пакінуў значныя інтэлектуальныя і карысныя для палітычнай навукі напрацоўкі, якія можна сьмела вызначыць як палітычную думку Раляна Барта. Варта адразу адзначыць ключавыя палітычныя тэксты мысьляра: артыкулы *«Scandale» du marxisme?*, *Humanisme sans paroles*, *Le marxisme est-il une «Eglise»?* (1951), *Ecrivains de gauche ou littérature de gauche?* (1952), *L'antisémitisme est-il de droite ou de gauche?* (1958), *Sur le régime du général de Gaulle* (1959), *La division des languages*, *La guerre des langues* (1973), *Que deviendrait une société qui renoncerait à se distancier?* (1974), *Entretiens et enquêtes* (1975), *Sade-Pasolini* (1976), *A quoi sert un intellectuel?* (1977), *Le Bruissement de la langue: Essais critiques IV* (1984). Сярод твораў варта вылучыць асабліва наступныя эсэ: *Michelet par lui-même* (1954), *Mythologies* (1957), *Alors la Chine?* (1975), *Roland Barthes par Roland Barthes* (1975), *Le Neutre: cours et séminaires au Collège de France 1977–1978*.

А палітычную думку Р. Барта прапаную падзяліць на наступныя тэмы:

1. Развагі, вызначэньні палітыкі і палітычнага.
2. Палітычная ідэалёгія (лявіца – правіца).
3. Палітыка і мова.
4. Палітычнае ў гісторыі.
5. Эліты, інтэлігенцыя.
6. Палітычнае і прыватнае.

## Палітычнае і палітыка

Р. Барт яшчэ раз падкрэсьлівае прынцыповае, хоць ужо вядомае ў палітычнай навуцы, адрозьненьне паміж палітычным і палітыкай (le politique et la politique) (Barthes, tome 4, 2002, pp. 862–864). Вядомы да Р. Барта падзел у палітычнай навуцы, тым ня менш, у вэрсыі мысьляра становіцца значна цікавей, крытычней, а яшчэ прасьцей за азначэньні клясыкаў паліталёгіі. Палітычнае (le politique) – фундамэнтальны парадак, рыса гісторыі, думкі, усяго, што ствараецца і аб чым вядзецца размова. Гэта само вымярэньне рэчаіснасьці. А вось палітыка (la politique) – гэта зусім іншая рэч. Гэта момант, калі палітычнае ператвараецца ў дыскурс паўтарэньня (discours ressassant) (Barthes, tome 4, 1993–2002, p. 862).

Барт адкрыта і жвава цікавіцца ўсім палітычным і прыгэтым не прымае палітыкі. Бо палітыка як дыскурс, а не дзейнасьць (для Барта вялізарнай сучаснай праблемай зьяўлялася тое, што «палітыка – больш не дзейнасьць, а дыскурс»), – малацікавая і адарваная ад рэчаіснасьці (Barthes, tome 4, 1993–2002, p. 863).

Тут таксама важна адзначыць, што Барт, хоць і трымае дыстанцыю ад палітыкі (але не ад палітычнага!), прыгэтым заклікае не ўвальвацца ў дэпалітызацыю, апалітызм, да якіх часта вядзе палітыка-дыскурс.

Якраз гэтыя развагі да сяньня застаюцца актуальнымі, бо добра тлумачаць стэрэатып: амальгамнае бачаньне палітыкі як выніку папулізму, як бруду ці неэфэктыўнага занятку, палітыкі як адвечных абяцанак і пустых прамоваў. Засьцярогі Барта і прынцыповы падзел паміж палітычным і палітыкай не пакідаюць нас адназначна гіпэрпалітычнымі ці, наадварот, выключна апалітычнымі: дзякуючы Барту заўсёды выразна бачацца два роўні палітычнага фэномэна.

Першы ровень – *палітычнае*, як пазытыўны вобраз палітыкі, як палітыка-дзейнасьць, як паўсядзённае разуменьне жыцьця прыватнага і публічнага ў зьвязцы з іншымі: суседам, грамадзтвам, дзяржавай і пад.

Другі ровень (своеасаблівы нэгатыўны вобраз палітыкі) – *палітыка-дыскурс*, палітыка-ўява, палітыка-канструкт элітаў. Паміж двума роўнямі фэномэну палітычнага Р. Барт шукае і знаходзіць кампраміс: балянс паміж палітычным і палітыкай месьціцца ў тым, каб любым мэтадам ня даць палітыцы застацца састарэлым, адарваным ад практыкі, рэчаіснасьці дыскурсам (Barthes, tome 4, 1993–2002, p. 862).

Яшчэ адзін вядомы, амаль культавы тэкст Барта – «Міталёгіі» – успрымаецца мною як проста і пераважна палітычны тэкст, дзе такі панятак, як «міт» зьяўляецца неадымнай часткай палітычнага, бо выступае ў Барта як сродак, зброя ідэалёгіі (Barthes, 1957, 216), а яшчэ як заўсёды дэпалітызаванае слова (Barthes, tome 1, 1993–2002, p. 853): слова, якое было палітычна важным, актуальным калісьці, і цяпер сталася толькі часткай палітычнага дыскурсу, палітычнай міталёгіі. Дзякуючы міту падтрымліваецца вера ў тую ці іншую ідэалёгію, сыстэму, а таму міт – частка палітыкі, а таму міт – да ўсяго палітычны дыскурс. Зрэшты, міт як слова, як сыстэма грамадаваньня, як пасланьне ў працы мысьляра разглядаецца як крытыка асноўных для Барта жупелаў (буржуазія, апалітычнасьць, правіца, лявіца, канфармізм, напрыклад) (Barthes, 2010, p. 47).

## Палітычная ідэалёгія (лявіца – правіца)

Вось тэма, у якой сэміёляг і мысьляр палітычнага пакінуў найбольш цікавую, сьмелую і маладасьледаваную спадчыну для палітолягаў. Ралян Барт не хаваў сваёй прыналежнасьці да лявіцы, аднак ягоныя артыкулы аб лявіцы і правіцы поўныя крытыкі ня толькі ў бок праві-

цы, але і ў роўнай ступені ў бок лявіцы (якая ўвалілася, на ягоную думку, у пастку пыхі і снабізму) (Barthes, 2002, pp. 135–137). У артыкулах, эсэ, інтэрвію ён шмат выкрываў антысэмітызм як правіцы, так і лявіцы, а шырэй гледзячы – ідэйныя і ідэалягічныя мутацыі лявіцы і правіцы ў кірунку да пэўнага падабенства (Barthes, 2002, p. 934).

Асобнай увагі заслугоўвае Бартава вызначэньне ідэалёгіі як «*агульнага ўяўленьня, панятку аб съвеце, палітычныя складнікі якога звычайна неасэнсаваныя*» (Barthes, 2002, pp. 933–934). Адсюль Барт падае вызначэньне правіцы і правай ідэалёгіі: «*правая ідэалёгія мае шэраг рысаў, у прыватнасьці, перакананьні і вера, якія ствараюць пэўную адчувальнасьць: адмаўленьне Гісторыі, вера ў нязьменную чалавечую прыроду, прызнаньне (схаванае ці адкрытае) сілы як каштоўнасьці, антыінтэлектуалізм і пад.*» (Barthes, 2002, pp. 933–934).

Мысьляр цікава і дасюль па-новаму падае паняткі «лявіца» і «правіца», апісвае, як з этымалёгіі выбудаваліся цэлыя ідэалягічныя, каштоўнасныя сыстэмы (нэгатыўная, хутчэй, трактоўка лявіцы, левага, левабаковага, якія зачастую асацыююцца з мяккасьцю, жаноцкасьцю, слабасьцю і, наадварот, выключна станоўчыя фарбы правіцы, правага). Леваручча, пісаньне левай рукой, лявіца наагул успрымаюцца традыцыйна палахліва і стрымана. Напрыклад, француская мова – гэта выключна «правая мова»[4] (кансэрватыўнасьць, элітарнасьць мовы Францускай Акадэміі, француская мова як бастыён, стваральніца сацыяльнай няроўнасьці). Напрыклад, дэбаты вакол фэмінізацыі мовы і пастаянныя правыя аргумэнты супраць гэтай зьявы ў Францыі цудоўна ілюструюць гэтае цьверджаньне. Прыгэтым этымалягічнае тлумачэньне палітычнага – гэта ўнівэрсальны і зачастую недаацэнены рэцэпт, прапанаваны мысьляром, які пасуе ня толькі да францускай, але і да ўсёй заходняй, у тым ліку беларускай, рэчаіснасьці.

Такім парадкам, ідэалягічнае прасякае ўсе палітычныя тэмы ў Барта (ад агульных тэмаў да тэмаў палітыкі і мастацтва, палітыкі і літаратуры, палітыкі і кінэматографу), але тэму мовы перадусім.

> Мова, як удасканаленьне любой моўнай дзейнасьці, – ані рэакцыйная, ані прагрэсысцкая, яна папросту фашысцкая, бо фашызм не перашкаджае, а прымушае гаварыць нешта.
> Р. Барт (Barthes, 1977)

## Палітыка і мова

Уклад Р. Барта ў сацыялінгвістычныя і моўна-гендарныя штудыі таксама часта застаецца на маргінэзе. Аналіз мовы – перадусім францускай – выходзіць у Барта па-за межы выключна моўнага аналізу:

4 Глядзіце другі эпіграф.

мысьляр трактуе мову як ідэалёгію, як міт, як палітычны дыскурс, які маргіналізуе ў гістарычнай пэрспэктыве пэўныя клясы, групы, а некаторыя мовы зводзіць да дыялектаў (Barthes, 2002, pp. 361–363). Разьвіцьцё граматыкі і дакладнай, карэктнай мовы, паўстаньне моўнай нормы наагул, якая першапачаткова ўпісвалася толькі ў каралеўскі двор, спавадавалі сацыяльныя разрэзы і канфлікты, што фіксуюцца ў грамадзтве па сяньняшні дзень (Barthes, 2002, pp. 96–98). Насамрэч, развагі мысьляра накладаюцца на асноўнае пасланьне сучасных сацыялінгвістаў француcкай і каталёнскай школаў (Boyer, 2012), якія цьвердзяць аб першапачатковых сацыяльных і палітычных чыньніках у фармаваньні мовы, у дамінаваньні экстрамоўных чыньнікаў наагул у разьвіцьці мовы. Барт удакладняе, што сацыяльныя і эканамічныя разрэзы і падзелы працягваюць існаваць як унутры адной мовы («слушная» француская мова элітаў, «памылковая» мова пралетарыяту ці сялянства), так і ўнутры моваў сьвету («вялікія» мовы і мовы «малыя»), Захаду ў прыватнасьці (Barthes, 2002, pp. 348–350). А ягонае скандальнае ў 1977 годзе цьверджаньне аб тым, што любая і пагатоў гэтак званая «вялікая» ці дамінантная мова – фашысцкая па сутнасьці (Barthes, 1977), бо заўсёды прымушае нас нешта гаварыць, выказваць ужо гатовыя татальныя клішэ, выразы, дасюль служыць заклікам і апраўданьнем антыкаляніялісцкага, антыімпэрскага і антытаталітарнага змаганьня. З улікам францускага ўнівэрсалісцкага, рэспубліканскага кантэксту, калі цягам гісторыі на карысьць цэнтральнай францускай мовы маргіналізаваліся і цкаваліся рэгіянальныя мовы, часьцяком зьведзеныя да статусу «дыялектаў», «гаворак», Бартава параўнаньне мовы з фашызмам выглядае ня проста сьмелым, але і прынцыпова адрозным ад бальшыні тагачасных францускіх левых поглядаў на пытаньне мінарытарных, рэгіянальных моваў. Такім парадкам, Барт заставаўся крытычным нават да блізкай яму левай ідэалёгіі і апярэдзіў сваёй крытыкай дасюль рыгідную ў моўным пляне францускую лявіцу. Дадзены аналіз цікавы і карысны для сучаснага разуменьня, напрыклад, занядбанасьці беларускай мовы і дамінаваньня расейскай мовы: Бартава канцэпцыя пра фашызм, татальны характар і сэрвільнасьць усялякай дамінантнай мовы апісвае ня толькі францускую сытуацыю, але і любую іншую.

Паралельна, як прыгадвалася вышэй у частцы пра панятак ідэалёгіяў, Барт актыўна задзейнічаў у аналізы палітычнага і сацыяльнага этымалягічны і лексычны рэсурсы. Так, этымалягічнае тлумачэньне любой палітычнай зьявы, панятку значна спрошчвае разуменьне самой зьявы (напрыклад, для разуменьня *палітычнай лявіцы* важна спачатку зразумець проста панятак «лявіца», «левы», які часта мае нэгатыўныя канатацыі і сугучны панятку «нягеглы»).

Зрэшты, у прыгаданых артыкулах бязупынку тлумачыцца, як функцыянуе моўная палітыка дзяржавы, як і кім выбудоўваецца палітычны дыскурс пра мову і як функцыянуе сам міт мовы, альбо міт пра мову.

## Палітычнае ў гісторыі

Гісторыя надта цікавіла Барта, як сьведчыць сьпіс ягоных артыкулаў і эсэ, прысьвечаных гістарычнай тэме (*Michelet par lui-même* (*Мішле пра сябе*), *Sur le régime du général de Gaulle* (*Аб рэжыме генэрала дэ Голя*), *Modernité de Michelet* (*Сучаснасьць Мішле*), *Aujourd'hui, Michelet* (*Сяньня, Мішле*), *Michelet, l'Histoire et la Mort* (*Мішле, Гісторыя і Сьмерць*), *Histoire ou Littérature?* (*Гісторыя ці Літаратура?*)). Мысьляр палітычнага пісаў пра гісторыю мастацтва, гісторыю літаратуры, гісторыю моды, але асобныя, вышэй прыгаданыя тэксты ахаплівалі сфэру палітычнага ў гісторыі. Так, невялікі артыкул пра рэжым генэрала дэ Голя, што зьявіўся ў 1959 годзе (Barthes, tome 1, 2002, pp. 984–986), можа быць узорным прыкладам палітычнай публіцыстыкі і аналітыкі адначасова. На трох старонках вобраз палітыка і прэзыдэнта Францыі і, асабліва, аўтарытарны мэтад кіраваньня аналізуюцца праз прызму мітаў і заўсёдашніх спасылак самога прэзыдэнта да сакральных вобразаў францускай, пераважна права- і хрысьціянацэнтрычнай гісторыі. Барт зноў падкрэсьлівае важнасьць панятку міт, да якога прыбягаюць ці ня ўсе актары палітычнага.

Цікавымі, такімі, што ўзбагачаюць агульныя веды, ёсьць таксама артыкулы Р. Барта пра некаторых важных для яго і заходніх культураў наагул філёзафаў і палітычных ідэолягаў (К. Маркс, М. Бакунін, Ж.-П. Сартр і М. Фуко). Зноў сьціслы (у некалькі сказаў), кропкавы і крытычны падыход, няхай і да сваіх ідэалягічных сымпатызантаў і братоў, адрозьнівае Барта ад іншых мысьляроў: так, важнасьць Маркса для Захаду ён апісаў праз прызму ўжо прыгаданых паняткаў «палітыка» і «палітычнасьць». Паводле Барта, важнасьць Маркса і ягоных ідэяў палягае ў тым, што якраз ён зьмяніў дыскурс і дыскурсыўнасьць (Barthes, tome 4, 2002, p. 868), зрабіўшы іх рэальнымі і актуальнымі, што зусім непадуладна сяньня бальшыні палітыкаў і мысьляроў. Такім парадкам, прызма Бартава палітычнага бачаньня гісторыі актуалізавала гістарычны досьвед францускіх і іншых эўрапейскіх дзяячоў, групаў, дэманстравала адначасова іх важнасьць, памылковасьць і патэнцыйную карыснасьць для сучаснасьці. Такі палітычны экскурс Р. Барта ў гісторыю папросту дазваляў вучыцца на памылках папярэдніх пакаленьняў і не зьдзяйсьняць іх у сучаснасьці.

## Эліты, інтэлігенцыя

Сярод развагаў аб палітычным у працах Барта часта ўсплывае фігура інтэлектуала, інтэлігенцыі, а таксама тэма элітаў (палітычных, сацыяльных, культурных) і месца, якое яны займаюць альбо якое ім надаюць у грамадзтве. Перадусім, для Барта інтэлектуал – гэта ня ўся эліта, а толькі культурная, сацыяльная, так бы мовіць. У палітыцы інтэлектуал заўсёды аўтсайдар, а таму ідэя стварэньня,

напрыклад, партыі інтэлектуалаў застаецца для мысьляра жартам (Barthes, tome 4, 2002, p. 570). Прыгэтым ён адрозьнівае інтэлектуала-«*вядзьмара*» (Ibid.) (маргінала, без улады) ад «*інтэлектуальнай касты*» (Ibid.) (пісьменьнікі, філёзафы, выкладнікі). Апошняя, на думку Р. Барта, ужо «не ўсаджваецца на лаве інтэлектуалаў» (Ibid.), бо мала хто пагаджаецца на ролю маргінала. Таму Барт падкрэсьлівае, што г.зв. «інтэлектуальная каста» – панятак, які заўсёды мяняецца, звужаецца: «інтэлектуальная каста» можа ператварыцца ў тое, супраць чаго яна звычайна змагаецца – мяшчанства, буржуазнасьць. А вось інтэлектуал-«вядзьмар», той, хто зьбівае ці ставіць пад сумнеў традыцыйныя арыентыры, парушаючы тым самым ідэалягічную карціну грамадзтва, зьяўляецца і застаецца тым, хто мае права называцца інтэлектуалам (Barthes, tome 4, 2002, p. 571). Барт дадае, што прынцыповым адрозьненьнем інтэлектуала ад усіх астатніх зьяўляецца актыўнае выкарыстаньне ім пісьма, мовы і моўных сродкаў (Barthes, tome 4, 2002, p. 572). Зрэшты, у адрозьненьне ад «інтэлектуальнай касты» гістарычная сытуацыя інтэлектуала далёка не камфортная, бо «гістарычна і дыялектычна ягоная функцыя – крытыкаваць мову буржуазіі нават у час кіраваньня буржуазіі» (Ibid.). Таму завяршальная фаза развагаў мысьляра, аформленая ў цудоўную цытату: «*Нават пазбаўлены ўлады, інтэлектуал заўсёды можа дзейнічаць*» (Barthes, tome 4, 2002, p. 570), тычыцца пераважна інтэлектуала-«вядзьмара». «Інтэлектуальная каста», такім парадкам, супрацьпастаўляецца інтэлектуалу-«вядзьмару»: паміж імі няма мяшаньня, бо першая катэгорыя не маргіналізуецца ў дэмакратыі (хіба ў фашысцкіх рэжымах (Barthes, tome 4, 2002, p. 571), а другая катэгорыя ёсьць заўсёды маргінальнай. Спасылаючыся на ўлюбёнага Брэхта, Барт нагадвае клясычнае пакліканьне інтэлектуала, якое застаецца нязьменным скрозь час: раскласьці буржуазную ідэалёгію, падрыхтаваць і разьвіць сілы, каб зьмяніць сьвет (Ibid.). Насамрэч, аб нязручнасьці, некамфортнасьці і нават небясьпецы быць інтэлектуалам – усе Бартавы высновы (Barthes, tome 4, 2002, p. 572).

## Палітычнае і прыватнае

Зрэшты, апошняя тэма ў межах палітычнай думкі Р. Барта зьяўляецца, з аднаго боку, дасюль важнай і актуальнай у заходніх дэмакратыях, а з другога боку, далікатнай і часьцяком ня цалкам агучанай пры жыцьці самім Р. Бартам. Гаворка йдзе аб спалучэньні палітычнага і прыватнага, інтымнага. Варта адзначыць, што прыватнае, асабістае ў Р. Барта, як і ў некаторых іншых тагачасных француских мысьляроў (С. дэ Бавуар, Ж.-П. Сартр) супрацьпастаўляецца публічнаму. Да ўсяго, панятак «палітычнае» часам накладваецца на панятак «публічнае»: так, у С. дэ Бавуар публічнае часта раўназначна палітычнаму, адкуль і ў нашым тэксьце сынанімічнасьць паняткаў «палітычнае» і «публічнае» (Strasser, 2012). Пазьней заходнія

фэміністкія і ЛГБТК-рухі[5] прыклалі шмат намаганьняў, каб зрабіць усё інтымнае палітычным, публічным. Гэтая стратэгія сталася дастаткова эфэктыўнай у распаўсюдзе адкрытых адносінаў і мадэляў, не абцяжараных традыцыяй і маралізмам. Але сам Р. Барт, як стане вядома ўжо пасьля ягонай сьмерці, ня быў сьмелым і адкрытым і не сьпяшаўся мяшаць інтымнае з палітычным. Тут маецца на ўвазе, перадусім, прыхаваная гомасэксуальнасьць мысьляра, якая жылася як сакрэт ці паралельнае жыцьцё (Roy, 2018). У сучаснай Францыі ў пэрыяд актыўнай дэмакратызацыі нораваў і дэмаргіналізацыі гомасэксуальнасьці часта вяртаюцца да «сакрэту Барта» (Roy, 2018) і падкрэсьліваюць пэўныя нутраныя комплексы і гамафобію мысьляра (Marty, 2006; Roy, 2018; Samoyault, 2015). Такім парадкам, выбітны мысьляр з шкадобай успрымаецца цяперашнімі ЛГБТК-актывістамі як той, хто нешта не дарабіў, на нешта не адважыўся дзяля супольнай справы.

Прыгэтым у іншым пытаньні – разбурэньні ці мінімізаваньні культу сям'і (гэтак званага *сем'янізму*) – Р. Барт дасягнуў значна большага посьпеху. Цягам жыцьця ўласным прыкладам і ў тэкстах ён пазначаў намарнасьць рэпрадукцыі сямейнай мадэлі, якая толькі памнажае траўмы і канфлікты, удакладняў, што ягоны выбар – сям'я без усякага культу сям'і, продкаў, сваяцтва (*La famille sans le familiasme*) (Barthes, 1975, p. 31). У гэтым якраз і ёсьць Бартава спалучэньне палітычнага і прыватнага: ён не адважыўся на прызнаньне ўласнай гомасэксуальнасьці, але тым ня менш у ягоным выбары прынцыповага адзіноцтва, бабыльства ў Францыі 50-70-х гадоў мінулага стагодзьдзя хаваліся сьмеласьць і нават пэўны радыкалізм. На прыкладзе сямейных фотаздымкаў, фотаальбомаў, якія часьцяком захоўваюцца, як рэліквіі, і якімі звычайна хваляцца сем'і, Р. Барт даводзіў сабе і іншым, што можна жыць «*без альбомаў, без традыцыйнай сям'і*» (Barthes, tome 5, 2002, p. 844–845). Такім парадкам, калі ня першы, то адзін з вядомых людзей францускай культуры 20-га стагодзьдзя апісаў і абгрунтаваў выбар мільёнаў сучасных заходнікаў на карысьць альтэрнатыўнага і ўжо не мінарытарнага ладу жыцьця, які не падразумявае ані сям'і, ані сямейных альбомаў.

## Заканчэньне

Зь вельмі разнастайнай і багатай на інтэрпрэтацыі спадчыны Раляна Барта можна вылучыць выразны палітычны пласт тэкстаў

[5] ЛГБТК – абрэвіяцыя, якая выкарыстоўваецца для абазначэньня супольнасьці лесьбіяк (Л), геяў (Г), бісэксуалаў і бісэксуалак (Б), трансгендараў і трансгендарак (Т) і квір-асобаў (К). Да канца 20-га стагодзьдзя абрэвіяцыя існавала ў скарочаным варыянце – ЛГБТ, потым паступова дапаўнялася і мела розныя варыянты (ЛГБТКІ, дзе І азначае інтэрсэксуалаў, ЛГБТ+ і іншыя). У дадзеным артыкуле я выкарыстоўваю больш пашыраны ў беларускамоўным полі варыянт абрэвіяцыі – ЛГБТК (LGBTQ).

мысьляра. Апрача ўжо хрэстаматыйных палітычных тэкстаў Барта пра ідэалёгію і марксызм, мы паступова адкрываем іншыя тэксты, якія ахопліваюць тэмы моўнай палітыкі, альтэрнатыўных мадэляў жыцьця, палітычнай гісторыі, масавых грамадзтва і культуры і г. д. Р. Барт мае поўнае права называцца нароўні з сэміёлягам, сацыёлягам, крытыкам – мысьляром палітычнага. Вяртаньне да ягоных сацыялінгвістычных і палітычных тэкстаў францускімі палітычнымі і акадэмічнымі элітамі, роўна як і замежнымі акадэмічнымі коламі, а таксама левымі палітыкамі Францыі, у дэбатах вакол фэмінізацыі мовы, месца інтэлектуалаў у грамадзтве ці вакол пытаньня абуржуазьненьня і нават зьнікненьня лявіцы сьведчыць аб актуальнасьці ідэяў, прапанаваных мысьляром больш за 40 год таму назад. Прыгэтым Р. Барт апярэдзіў сваіх суайчыньнікаў у пытаньні адкрытасьці і эмансыпацыі рэгіянальных моваў, у пытаньні крытыкі францускага ўнівэрсалізму ці яшчэ ў пытаньні вольнага, безсямейнага ладу жыцьця і крытыкі дыктату сям'і і сем'янізму.

Зрэшты, аднове, у тым ліку, палітычнай спадчыны Барта, могуць паспрыяць пераклады ягоных тэкстаў на мовы, на якіх яны дасюль не зьяўляліся, а таксама дадатковыя пераклады тых тэкстаў Барта, што ахопліваюць палітычнае вымярэньне.

## References


Barthes, R. (1993–2002) *Œuvres complètes 5 volumes*, Paris: Éditions du Seuil.

Barthes, R. (1975) *Roland Barthes par Roland Barthes*, Paris: Éditions du Seuil.

Barthes, R. (1977) *Extrait de la Leçon inaugurale au Collège de France, le 7 janvier.* [online]. Available at: http://levertparadisdesamoursenfantines.over-blog.com/2014/01/roland-barthes-extrait-de-la-le%C3%A7on-inaugurale-au-coll%C3%A8ge-de-france-le-7-janvier-1977.html. [Accessed 9 December 2018].

Marty, É. (2006) *Roland Barthes. Le métier d'écrire*, Paris, Seuil, coll.: «Fiction et Cie».

Samoyault, T. (2015) *Roland Barthes*, Paris, Seuil, coll.: «Fiction et Cie».

Strasser, A. (2012) Simone de Beauvoir, du Deuxième sexe à La Vieillesse: quand l'intime gagne le politique. *Itinéraires*, 2012, no. 2, pp. 93–103.

Roy, A. (2006) *Les garçons et l'impossibilité de l'amour.* [online]. Available at: http://www.fugues.com/231142-article-les-garcons-et-limpossibilite-delamour.html. [Accessed 10 Nobember 2018].

Boyer, H. (2012) Singularité(s) de la sociolinguistique du domaine catalan. Un repérage épistémologique. *Histoire, Épistémologie, Langage*, Année 2012, vol. 34, no. 2, pp. 29–41.

Gaillard F., Noudelmann, F. (2001) Introduction, Roland Barthes après Roland Barthes. *Rue Descartes*, 2001/4, no. 34, pp. 7–8.

Noudelmann F. (2001) Roland Barthes: de la main gauche. *Rue Descartes*, 2001/4, no. 34, pp. 45–60.